# ЖАНЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

На працягу ўсяго гістарычнага развіцця Беларусі асаблівая роля ў грамадстве належала жанчынам. Яны ствараюць літаратурна-мастацкія творы, выступаюць на сцэне тэатраў, робяць навуковыя адкрыцці, выкладаюць у вышэйшых навучальных установах, займаюць дзяржаўныя пасады, прымаюць удзел у спартыўных спаборніцтвах.

Прапанаваны дадатак прысвечаны знакамітым жанчынам, якія ўнеслі значны ўклад у гісторыю, культуру, навуку, медыцыну і іншыя сферы нашага грамадства. Выбарачна прадстаўлены іх кароткія біяграфіі. Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у анлайн-энцыклапедыі «Беларусь у асобах і падзеях».

## *Гісторыя Беларусі*

**Бона Сфорца, дачка Джана Галеаца Сфорца** (1494–1557), каралева польская і вялікая княгіня літоўская, другая жонка вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта I Старога.

**Валянціна Мінская (свецкае імя Сулкоўская Валянціна Фёдараўна)** (1888– 1966), блажэнная, святая Беларускай Праваслаўнай Царквы.

**Вольга (пасля хрышчэння Алена)** (каля 890 – 969), вялікая княгіня кіеўская, жонка князя Ігара, першая на Русі святая.

**Дарэўская Апалонія (Дарота)** (1767(?) – пасля 1797), танцоўшчыца, прыгонная А. Тызенгаўза, першая салістка трупы «Таварыства танцоўшчыкаў яго каралеўскай вялікасці» ў Варшаве.

**Ефрасіння (Еўфрасіння) Полацкая (свецкае імя Прадслава), дачка Святаслава Усяславіча** (каля 1101 ці 1104 – 1173), полацкая князёўна, асветніца і мецэнатка, заснавальніца жаночага і мужчынскага манастыроў, якія сталі цэнтрам асветы ў Полацкім княстве, прападобная, першая жанчына гэтага гістарычнага перыяду, кананізаваная ў святыя.

**Настасся Слуцкая (у дзявоцтве Мсціслаўская, па мужу Алелькавіч), дачка Івана Юр'евіча** (1473–1524), княгіня, якая ўвайшла ў айчынную гісторыю як мужная абаронца роднай зямлі ад нападаў татар.

**Рагнеда Рагвалодаўна (Гарыслава, духоўнае імя Анастасія)** (960(?)–1000), полацкая князёўна, асветніца.

**Радзівіл Барбара, дачка Юрыя Радзівіла** (1520–1551), вялікая княгіня Вялікага Княства Літоўскага, каралева Польшчы, другая жонка Жыгімонта II Аўгуста.

Нарадзілася ў Вільні ў сям'і кашталяна віленскага і вялікага гетмана Вялікага Княства Літоўскага Юрыя Радзівіла і яго другой жонкі Барбары з Колаў. Атрымала хатнюю адукацыю. У 1537 г. выйшла замуж за навагрудскага ваяводу Станіслава Гаштольда, аднак праз пяць гадоў аўдавела. У 1547 г. тайна абвянчалася з Жыгімонтам II Аўгустам. У 1548 г. кароль прадставіў Барбару як законную жонку і ў выніку, нягледзячы на незадавальненне сейма і сваёй маці Боны Сфорца, дамогся афіцыйнага прызнання шлюбу. 7 снежня 1550 г. Барбара была каранавана. У знак сваёй прыхільнасці муж падараваў ёй багатыя ўладанні, шматлікія маёнткі і землі. 8 мая 1551 г. каралева памерла ў Кракаўскім Вавелі. Згодна з апошняй воляй, яе цела было адвезена ў Вільню і пахавана ў Віленскім кафедральным саборы Святога Станіслава. Гісторыя кахання Жыгімонта II Аўгуста і Барбары стала асновай для з'яўлення шматлікіх легенд, паданняў, літаратурна-мастацкіх твораў.

**Велько, А. В.** Барбара Радзивилл / А. В. Велько. – Минск : Белорусский государственный педагогический университет, 2024. – 32 с. : ил., цв. ил., портр., схемы. – (Имя в истории).